**VI Майскія Віткаўскія чытанні**
**“Чарадзейная краіна Васіля Віткі”**

Яны пачаліся 16 мая 2013 года ў дзень нараджэння пісьменніка-земляка. Юныя случчане адправіліся ў Мінск на прэзентацыю чарговага нумара часопісаў “Вясёлка” і “Буся”, якая адбылася ў дзіцячай бібліятэцы-філіяле №6 імя Васіля Віткі Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска. Дзеці пазнаёміліся з новымі творамі беларускіх аўтараў, змешчанымі





*Юныя случчане на прэзентацыі чарговых нумароў часопісаў “Вясёлка” і “Буся” з беларускімі пісьменнікамі*

на старонках маляўнічага дзіцячага выдання, паслухалі пісьменнікаў, пагутарылі з імі. На добрую памяць у аматараў беларускага слова засталіся сувеніры ад любімага часопіса, аўтографы беларускіх літаратараў Уладзіміра Ліпскага, Міколы Чарняўскага, Леаніда Улашчанкі, Аксаны Спрынчан, Ніны Галіноўскай, Алены Масла. Фотаздымкі разам з любімымі аўтарамі засталіся на добры ўспамін аб незабыўнай сустрэчы. Цудоўныя ўражанні пакінула ў дзяцей і наведванне музея Васіля



*Гурт “Вася Вясёлкін і К$^0$” на радзіме Васіля Віткі*

Віткі, які створаны пры сталічнай бібліятэцы.

Майскі Віткаўскі тыдзень падоўжыўся паездкай літаратурнага гурта “Вася Вясёлкін і К”, створанага пры дзіцячым аддзеле, у Акцябрскую сельскую базавую школу, якая носіць імя Васіля Віткі.



*Вернісаж на прыродзе*

На ліпавай алеі, закладзенай у дзень 100-гадовага юбілею пісьменніка, адбылася паэтычная хвілінка “Урокі роднага слова” з удзелам настаўнікаў, вучняў, жыхароў вёскі.

Разам з педагогамі школы і супрацоўнікамі раённай цэнтральнай бібліятэкі рабяты пабывалі ў школьным музеі, дзе сярод іншых ёсць экспазіцыя «Васіль Вітка – наш зямляк». Госці мелі магчымасць пагартаць падшыўкі былых выпускаў «Вясёлкі», якія школе падарыла рэдакцыя часопіса, паглядзець фотаздымкі з сямейнага альбома пісьменніка, дакрануцца да яго асабістых рэчаў, падораных школьнаму музею сынам і дачкой. Тут жа захоўваецца і медаль імя Васіля Віткі, якім узнагароджана школа.




*У школьным музеі цікава і пазнавальна*

Разам з мясцовымі школьнікамі, Дзедам Усяведам і Васем Вясёлкіным рабяты чыталі вершы пісьменніка-земляка, некаторых іншых беларускіх аўтараў. Цікавую інсцэніроўку па матывах п’есы-казкі «Няхай ззяе «Вясёлка» ўвазе ўдзельнікаў мерапрыемства прадставілі вучні Акцябрскай школы. Напрыканцы сустрэчы кожны гімназіст атрымаў часопіс «Вясёлка».

Часопісная кругасветка “Цуды на планеце “Вясёлка” цэлы тыдзень збірала ў сценах бібліятэкі чытачоў. Удзельнікі літаратурнага падарожжа

пазнаёміліся з часопісам, пачыталі ўпадабаныя артыкулы. Юныя эрудыты паўдзельнічалі ў літаратурнай віктарыне “Чытайце з намі! Чытайце самі!”. Такое чытанне адкрывае доступ у свет асаблівых эмоцый, перажыванняў і станоўча зараджае розум дзіцяці.

Беларуская кніга здольная выклікаць нават у нечытаючага дзіцяці давер да самога працэсу чытання, калі існуе пры яе папулярызацыі аптымальнае спалучэнне традыцыйных і інавацыйных формаў работы.



*Часопісная кругасветка*
*“Цуды на планеце “Вясёлка”*



*На свята прйшла дзяўчына*
*Вясёлка*